# Практыкум па тэме «Беларусь і цывілізацыі свету ў перыяд ранняга Новага часу»

## Выяўленне заканамернага і выпадковага

**1.** Статут Вялікага Княства Літоўскага — звод законаў, які складаў прававую аснову дзяржавы.

### СТАТУТЫ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА

**1529 г.**



Першы сістэматызаваны звод законаў розных галін права. У ім атрымалі юрыдычнае замацаванне асновы грамадскага і дзяржаўнага ладу, прававое становішча сацыяльных груп насельніцтва, парадак утварэння, склад і паўнамоцтвы органаў дзяржаўнага кіравання і суду

**1566 г.**



Замацаваў новы адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел, новую сістэму судоў, аддзяленне суду ад адміністрацыі, выбарнасць суддзяў, прынцып адзінства права на ўсёй тэрыторыі дзяржавы і ў дачыненні да ўсіх падданых, прыярытэт пісанага закона і дзяржаўны суверэнітэт

**1588 г.**



Заканадаўча аформіў захаванне Вялікага Княства Літоўскага як самастойнай дзяржавы. Сістэматызацыя права адбывалася на новых прынцыпах: абмежаванне ўлады вялікага князя; прынцып падзелу ўлад; адзінства права для ўсёй дзяржавы і ўсіх паўнапраўных насельнікаў, але ў залежнасці ад сацыяльнага становішча; прыярытэт пісанага права

**А.** Чаму абагульненне нормаў права ў ВКЛ было ўнікальнай з'явай для свайго часу і шмат у чым нават апераджала яго?


Леў Сапега,
дзяржаўны і ваенны дзеяч ВКЛ

„А калі якому народу сорамна права свайго не ведаць, асабліва нам, якія не чужой якой мовай, але сваёй уласнай правы запісаныя маем і ў кожны час што нам неабходна да адбіцца ўсякай крыўды можам ведаць“.

Прадмова да Статута 1588 г.

Б. Статут 1588 г. — выбітны помнік юрыдычнай думкі феадальнай эпохі.

Даведайцеся, хто браў удзел у яго распрацоўцы. На якой мове ён быў напісаны і дзе выдадзены?

Як вы лічыце, чаму прадстаўнікі Польшчы не дапускалі зацвярджэння Статута 1588 г. на агульным сойме Рэчы Паспалітай, а Жыгімонт III Ваза зацвердзіў яго сваім прывілеем?

Зрабіце вывад, наколькі заканамернае з пункту погляду гістарычнага развіцця ВКЛ у канцы XVI ст. было прыняцце Трэцяга Статута.

## Адрозненне факта ад меркавання

**2.** Больш за 200 гадоў тэрыторыя Беларусі ўваходзіла ў склад Рэчы Паспалітай. Вядомы беларускі гісторык, першы прэзідэнт Беларускай акадэміі навук У. М. Ігнатоўскі ў сваім «Кароткім нарысе гісторыі Беларусі» выказаў наступную ідэю: «У Беларусь прыйшла рэспубліка паноў, якіх ніхто не мог утрымаць. Уся ўлада была ў іх руках. Яны трымалі ў сваіх руках сойм, соймікі, караля, цэнтральную і мясцовую адміністрацыю і ўзброеныя сілы».

А. Ці згодныя вы з меркаваннем вучонага, што кіраванне дзяржавай у Рэчы Паспалітай ад першых гадоў яе існавання знаходзілася ў руках шляхецкага саслоўя? Канкрэтызуйце фактамі ваша меркаванне.

Сучасная навука мае ў сваім распараджэнні разнастайныя гістарычныя крыніцы, якія адлюстроўваюць ролю і ўплыў шляхты на палітычнае жыццё Рэчы Паспалітай на працягу ўсяго часу яе існавання.

Б. Вывучыце прадстаўленыя фрагменты крыніц і вызначце, пра якую з'яву ва ўнутрыпалітычным жыцці краіны яны сведчаць. Дайце ацэнку апісаным з'явам. Якія былі іх наступствы для Рэчы Паспалітай?

1. З апісання бойкі паміж прыхільнікамі і праціўнікамі Сапегаў на павятовым сойміку 1697 г. у Берасцейскім замку.

*«...пан Хжаноўскі... цераз даволі вялікі і высокі насып у Берасцейскім замку, як утрапёны, скокнуў галавой долу ў Мухавец. Тут жа шляхта таксама схапілася за шаблі, на пана падкаморыя і паноў Садоўскіх [яны ўзначальвалі антысапегаўскую партыю] так навалілася, што хоць стары Садоўскі і кульгавы быў, але скокнуў на мост наперад сыноў і далей [яны] з панам падкаморыем... так беглі, што не ўсякі б іх дагнаў... Пан падкаморый скочыў і не трапіў на мост, моцна выцяўся галавой, папаўшы на чыюсьці шаблю, тое самае панам Садоўскім, старому і маладому... дасталося, што пасмы валасоў з мясам на мосце валяліся. Зачырванілі мост і Мухавец...».*

2. З наказу Гродзенскага павятовага сойміка паслам на Варшаўскі сойм ад 22 сакавіка 1773 г.

*«Наша Рэч Паспалітая зрушана і аслаблена няспыннымі бескаралеўямі і лёгка ўзніклымі з прыватнага пачыну беспарадкамі. Не забяспечана прыняцце рашэнняў соймамі, таму няма ні ўнутранай, ні знешняй бяспекі. Няма сілы, якая б забяспечвала выкананне законаў. З гэтых трох прычын няма ўлады ў краіне, а навідавоку адно наступствы, што вынікаюць з непарадку».*

3. З мемуараў апошняга караля Рэчы Паспалітай Станіслава Аўгуста Панятоўскага.

*«...На працягу двух стагоддзяў доўжылася спаборніцтва Сапегаў і Радзівілаў, а безупынная зайздрасць тых да Чартарыйскіх і велізарная перавага багацця і ўплыву гэтых трох дамоў пры [каралеўскім] двары перад усімі іншымі спарадзілі ў Літве сярод мясцовай шляхты такую*

*патомную залежнасць ад аднаго з трох вялікіх дамоў, што большая частка [шляхты] не ўяўляла сабе без іх свайго існавання...».*

В. Як вы лічыце, да якіх мэт імкнуліся магнаты, а да якіх — дробная і беззямельная шляхта?

## Ажыццяўленне пошуку інфармацыі

**3.** «Залатым векам» развіцця кірмашоў у Заходняй Еўропе была эпоха Сярэднявечча. На тэрыторыі Беларусі на рэгулярнай аснове гэтая форма гандлю атрымала пашырэнне з канца XV ст., а найвышэйшага росквіту дасягнула ў XVIII — пачатку XIX ст. Кірмашы былі прымеркаваны да розных хрысціянскіх святаў і цягнуліся ад тыдня да месяца.

А. Як вы лічыце, ад чаго залежала працягласць кірмашоў?

Б. Разгледзьце карціну беларускага мастака Алеся Сушы «Кірмаш», якая ўпрыгожвае інтэр'ер Нацыянальнай бібліятэкі ў Мінску, і апішыце месца правядзення кірмашу.



*Кірмаш. Мастак А. Суша*

Адным з самых вядомых на тэрыторыі Беларусі быў Ганненскі кірмаш у Зэльве. Гісторыя яго ўзнікнення бярэ пачатак у 1501 г., калі прывілей на правядзенне ад караля Аляксандра Ягелончыка атрымала Ганна Улініч — удава былога гаспадара Зэльвы. Перыяд росквіту кірмашу пачаўся ў 1721 г., пасля таго як мястэчка перайшло ва ўладанне вядомага і багатага роду Сапегаў. Гандаль вёўся з 25 ліпеня да 25 жніўня. Пакупнікам прапаноўвалі велізарны выбар самых разнастайных тавараў на ўсякі густ і кашалёк: ад шкла і каштоўнасцей да кавы і парцаляны. Тут жа былі прадстаўлены і вырабы мясцовых майстроў. Напрыканцы XVIII ст. Ганненскі кір-

маш лічыўся найважнейшым пасля Лейпцыгскага ў Германіі як па абароце, так і па колькасці купцоў і гандляроў.

В. Чаму кірмаш называўся Ганненскім, калі праходзіў у Зэльве?

Г. Выява асноўнага тавару, які з'яўляецца фірмовым атрыбутам куплі-продажу на гэтым кірмашы, упрыгожвае герб Зэльвы. Назавіце яго. Чаму менавіта гэты тавар карыстаўся ў тыя часы вялікім попытам?

Ганненскі кірмаш у Зэльве быў не толькі гандлёвым цэнтрам, але і месцам з разнапланавай «культурнай праграмай». Для пацехі публікі запрашалі музыкаў, тэатральных і цыркавых артыстаў, цыганоў з дрэсіраванымі мядзведзямі, адкрывалі часовыя корчмы, піўныя. Шматлікім гасцям прапаноўвалі паглядзець пастаноўкі мясцовага тэатра, які належаў Сапегам, і масу іншых забаў.

Д. Польскі пісьменнік і публіцыст XIX ст. Юзаф Крашэўскі пісаў: «...з вельмі даўняга часу Зэльва і яе жыхары падпарадкоўваюцца дзіўнаму правілу: адзінаццаць месяцаў штогод яны гібеюць і толькі месяц — жывуць». Як вы разумееце сэнс гэтага выказвання?

З развіццём у Беларусі крамнага гандлю кірмашы пачалі траціць сваё значэнне і прыходзіць у заняпад. У наш час яны ўжо не адыгрываюць такой значнай ролі і існуюць большай часткай як даніна традыцыям. Прыкладам удалага працягу кірмашовага гандлю ў нашай краіне выступае адраджэнне Ганненскага кірмашу ў Зэльве.

Е. Даведайцеся, калі кірмаш зноў пачалі праводзіць. Параўнайце Ганненскі кірмаш XVIII і XXI стст.

Ж. Якія сучасныя віды і формы кірмашоў, што праводзяцца ў Рэспубліцы Беларусь, вам вядомыя?

## Аддзяленне галоўнага ад другаснага

4. Эпоха Асветніцтва — адна з найярчэйшых у гісторыі, характарызуецца развіццём навуковай, філасофскай і грамадска-палітычнай думкі. Аднак часам яе таксама называюць «векам вялікіх адкрыццяў і вялікіх памылак».

А. Чаму эпоха Асветніцтва атрымала такую назву? Што значыць «асвечаны» чалавек, грамадства, свет?

Б. Назавіце найбольш выбітных дзеячаў Асветніцтва. Апішыце іх асноўныя ідэі і магчымыя, на вашу думку, «памылкі».

Эпоха Асветніцтва знайшла адбітак не толькі ў ідэях мысляроў, але і ў паўсядзённым жыцці людзей таго часу. Пачалася актыўная барацьба з сур'ёзнымі хваробамі, у прыватнасці, людзі пагаджаліся на прышчэпкі супраць воспы, а гарадскія ўлады сур'ёзна заклапаціліся пытаннямі добраўладкавання і санітарнага стану гарадоў. Дзякуючы пашырэнню ў Еўропе бульбы, якая зрабілася «другім хлебам», колькасць галадаючых у XVIII ст. у параўнанні з папярэднім стагоддзем скарацілася ўдвая.

У XVIII ст. адбываецца сапраўдная рэвалюцыя ў арганізацыі жытла. Рабочае месца аддзяляецца ад месца паўсядзённага жыцця ўсёй сям'і, а сямейны дом перастае быць крамай або майстэрняй, дзе гандляр або рамеснік даваў прытулак вучням або падмайстрам. Гаспадар цяпер кожны дзень выпраўляўся на працу, тэрытарыяльна аддзеленую ад жытла.

Менавіта ў эпоху Асветніцтва сярод асабістых прадметаў побыту з'явіліся такія звыклыя для нас гадзіннікі, кішэнныя люстэркі, парасоны. Усе пералічаныя факты сведчаць нам пра складванне новай культуры паўсядзённасці.

В. Растлумачце, як ідэі Асветніцтва паўплывалі на пералічаныя змены ў паўсядзённым жыцці людзей.

Г. Вызначце, якая ключавая ідэя эпохі Асветніцтва зрабілася лакаматывам, рухавіком многіх змен гэтай і наступных эпох у гісторыі чалавецтва.

## Вызначэнне ролі асобы ў гісторыі

5. Успомніце імёны вядомых людзей, якія жылі на тэрыторыі Беларусі ў XVI–XVIII стст., выканайце праектнае заданне на выбар.

А. Складзіце топ-5 «Асоба ў гісторыі». Свой выбар аргументуйце.

Б. Зрабіце постар (ад англ. poster — афіша, аб'ява, плакат), прысвечаны пэўнай асобе і яе ролі ў гісторыі. Падрыхтуйце яго прэзентацыю.

В. Складзіце інтэрактыўны даведнік «Скульптурныя кампазіцыі і помнікі гістарычным асобам і дзеячам культуры».